Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Будзьце пільныя

КАБ НЕ НАБЫЦЬ САПСАВАНЫЯ ПРАДУКТЫ...

З пачатку гэтага года ў выніку праверак магазінаў выяўлены 171 від харчовай прадукцыі, якая не адпавядала патрабаванням бяспекі. Больш за 49 тон забаронена да рэалізацыі. Пра гэта паведаміла загадчык аддзялення гігіены харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вія ШУКЕВІЧ. Таксама спецыяліст расказала, на што варта звяртаць увагу, каб не набыць сапсаваныя прадукты.

Самыя распаўсюджаныя парушэнні, якія дапускаюць магазіны, — парушэнні ўмоў захоўвання і рэалізацыі, тэрмінаў прыдатнасці тавару, яго маркіроўкі, адсутнасць дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку, нездавальняючы санітарны стан аб'ектаў, абсталявання і інвентару.

— У любым магазіне звяртайце ўвагу на санітарны стан гандлёвай залы, знешні выгляд прадаўца, на тэрмін прыдатнасці прадукцыі. Калі тавар выклікае сумненні, папрасіце дакументы, якія пацвярджаюць яго якасць і бяспеку, — раіць Вія Шукевіч.

Спецыяліст нагадвае, што харчовыя прадукты, якія хутка псуюцца, патрабуюць асаблівых умоў рэалізацыі і захоўвання.

— Яны рэалізуюцца пры тэмпературы 4 (+/-2) градусы. У магазіне павінен быць халадзільнік, які спраўна працуе. Цяпер яны з тэрмометрамі, і нескладна праверыць, пры якой тэмпературы захоўваюцца прадукты. Калі вы заўважылі, што халадзільнае абсталяванне працуе неэфектыўна, тавар у такім магазіне лепш не набываць, — адзначае суразмоўніца.

Таксама ў перыяд летняй спёкі важна старанна прытрымлівацца правілаў пры прыгатаванні і захоўванні страў. Перад тым як чысціць фрукты, у прыватнасці апельсіны, мандарыны, банаты, іх варта спаласнуць у кіпячонай ці праточнай вадзе. Харчовыя прадукты павінны захоўвацца ў месцах, недаступных для насякомых, грызуноў і хатніх жывёл. Пры транспарціроўцы ежы, якая хутка псуецца, неабходна выкарыстоўваць тэрмакантэйнеры. Акрамя гэтага, важна мыць рукі перад прыгатаваннем ежы, прымяняць асобныя дошкі для сырой і гатовай прадукцыі, прыгатаваныя стравы хутка ахалоджваць і змяшчаць у халадзільнік. Калі вы адчуваеце сімптомы атручвання — боль у жываце, млоснасць і іншае, — у такім стане гатаваць не рэкамендуецца ні для сябе, ні для іншых.

Як адзначае **загадчык аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Уладзімір ПАШКОВІЧ**, сёлета назіраецца зніжэнне захваральнасці на кішэчныя інфекцыі на 12 %, у тым ліку і на вірусныя. А змяншэнне выпадкаў віруснага гепатыту А адзначаецца на 70 %.

— Пакуль эпідэміялагічная сітуацыя спрыяльная. Аднак пачынаецца сезон адпачынкаў, і не ўсюды становішча такое ж спакойнае. Пры выбары краіны для паездкі варта даведацца аб эпідсітуацыі ў гэтым рэгіёне. Важна аформіць медыцынскую страхоўку — яна дазволіць атрымаць медыцынскую дапамогу, — нагадвае эксперт. — Інфекцыйныя захворванні здараюцца, калі бактэрыі і вірусы трапляюць у арганізм праз нямытыя рукі, няякасную ваду і прадукты харчавання. Таму сачыце за гігіенай на адпачынку: выкарыстоўвайце бутыляваную ваду, харчуйцеся ў дазволеных тураператарам месцах, не набывайце прадукты на стыхійных рынках. Для ахаладжання напояў не выкарыстоўвайце лёд, прыгатаваны з невядомых крыніц.

Калі пасля вяртання з-за мяжы вы адчулі сябе дрэнна, звярніцеся да ўрача і раскажыце, дзе адпачывалі. Не варта займацца самалячэннем, у тым ліку самастойна прызначаць сабе антыбіётыкі.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У ЛАГЕРЫ... БЕЗ МАМЫ

Як дапамагчы дзіцяці адаптавацца і нічога не забыць

Куды адправіць дзіця: у лагер ці да бабулі ў вёску? Штогод тысячы бацькоў задаюць сабе гэта пытанне. З летам многія звязваюць спадзяванні на аздараўленне і загартоўванне. Хтосьці адвозіць дзіця на ўсё лета ў вёску ці на дачу, іншыя едуць на мора, а для кагосьці летнія лагеры — выдатнае выйсце з сітуацыі. Але тут не заўсёды ўсё праходзіць гладка.

Што трэба ўлічваць бацькам

Перш чым адправіць дзіця ў лагер, бацькі павінны ўлічваць некалькі асаблівасцяў. Па-першае, ці ёсць у самога дзіцяці жаданне туды ехаць. Па-другое, ці дазваляюць узрост, яго характар, псіхалагічныя якасці на доўгі час заставацца без бацькоў? Аптымальны ўзрост, з якога можна адпраўляць дзіця ў лагер, — восем гадоў. Па-трэцяе, ці дазваляе здароўе малога вытрымаць строгі распарадак жыцця ў арганізаваным дзіцячым калектыве?

Калі на гэтыя пытанні ў вас ёсць станоўчы адказ, можна смела рыхтаваць дзіця да паездкі.

Падрыхтоўка да ад'езду

— Калі дзіця ведае ад раўеснікаў, што такое лагер і колькі там цікавага, то ў яго хутчэй за ўсё сфарміравана пазітыўная матывацыя, і бацькам варта падтрымаць гэты станоўчы зарад, — адзначае **інструктар-валеолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Ірына БРЫТВІЧ.** — Калі ў малога такой інфармацыі няма і яно адчувае трывогу мамы і таты, то яму будзе складана адаптавацца да новых умоў. Дзеці вельмі ўспрымальныя да хваляванняў дарослых. Таму чым спакайней бацькі будуць рэагаваць на яго ад'езд, тым лягчэй дзіця ўспрыме расставанне і новыя ўмовы жыцця ў лагеры.

Бацькам пажадана сабраць як мага больш інфармацыі і расказаць дзіцяці, дзе знаходзіцца лагер, якія ўмовы, гурткі, секцыі і забавы там ёсць, хто будзе ў яго выхавальнікам, калі можна будзе да яго прыязджаць і іншае. Гэта дапаможа сфарміраваць у малога цікавасць да новых знаёмстваў і заняткаў.

Важна не забыцца абмеркаваць з дзецьмі правілы і нормы паводзінаў у калектыве, пагаварыць аб шкодзе курэння і алкаголю, аб захаванні мер бяспекі ў лагеры, беражлівых адносінах да маёмасці, правілах паводзінаў на вадзе.

Перад паездкай бацькі могуць даведацца пра адрасы дзетак, якія едуць у лагер разам з вашым малым, і пазнаёміць іх загадзя — разам будзе лягчэй адаптавацца ў новым калектыве.

Што ўзяць?

Дзіця павінна прымаць актыўны ўдзел у падборы экіпіроўкі для лагера. Неабходна браць з сабой толькі тыя рэчы, без якіх хлопчыку ці дзяўчынцы немагчыма абысціся на працягу 3—4 тыдняў. Сама сумка павінна быць з моцным корпусам і ручкамі. Пажадана, каб яна не была грувасткай і змяшчалася ў шафу.

Асабліва старанна варта збіраць прадметы асабістай гігіены. Абавязкова трэба з сабой узяць:

- Зубную шчотку і пасту;
- Туалетнае мыла ў мыльніцы;
- Гаспадарчае мыла ці пакецік пральнага парашку для мыцця ніжняй бялізны і шкарпэтак;
- Мачалку і шампунь, таксама, магчыма, пажыўны і сонцаахоўны крэм;
- Расчоску ці шчотку для валасоў, нажніцы для пазногцяў;
- Сродкі ад камароў і кляшчоў (рэпеленты).

Варта растлумачыць дзіцяці, што абменьвацца расчоскамі, мачалкай, адзеннем і іншымі асабістымі прадметамі ні ў якім разе нельга па правілах гігіены. Падчас прагулак у лесе праз 1—2 гадзіны дзеці павінны праводзіць рэгулярныя сама- і ўзаемаагляды адзення і скуры на наяўнасць кляшчоў (на аднатонным светлым адзенні кляшчы больш заўважныя).

Адзенне і абутак павінны ўключаць:

- Спартыўны касцюм і закрыты спартыўны абутак;
- Купальнік, плаўкі;
- Адзенне для паўсядзённай носкі (1—2 камплекты);
- Сонцаахоўны галаўны ўбор;
- Адзенне для вечароў адпачынку і дыскатэк;
- 5—6 пар шкарпэтак;
- 2—3 змены ніжняй бялізны;
- Цёплы світар ці кофту;
- Воданепранікальную вятроўку, пажадана з капюшонам;
- Зручныя туфлі для паўсядзённай носкі;
- Пакаёвыя тапачкі, сланцы для басейна.

Дзецям, канешне, непажадана даваць з сабой мабільны тэлефон. Калі ж малое яго з сабой бярэ, то неабходна строга папярэдзіць, каб тэлефанавала яно толькі ў выпадку крайняй неабходнасці. Калі дзіця любіць чытаць, маляваць, мае нейкае іншае хобі, то няхай возьме з сабой кнігу, алоўкі і іншыя прадметы для любімых заняткаў.

Знаёмячыся з выхавальнікам, бацькі павінны папярэдзіць яго пра асаблівасці характару дзіцяці, паведаміць, ці ўмее яно плаваць, якую ежу не есць і іншае. Лепш гэта нават запісаць на лісток і аддаць у рукі.

Што бацькам забаронена прывозіць у лагер

У загарадных аздараўленчых лагерах звычайна шасціразовае харчаванне. Гэта сняданак, другі сняданак, абед, падвячорак, вячэра і другая вячэра. У лагер забаронена прывозіць чыпсы, газіраваныя напоі, асабліва тыя, што ўтрымліваюць фарбавальнікі. Не варта везці ягады, малочныя прадукты (тварожныя сыркі, марожанае, сыр), мясныя прадукты (каўбасы, сасіскі, мясныя паштэты), пірожныя. Фрукты трэба прывозіць толькі памытымі.

Калі дзеці паехалі ў лагер упершыню, бацькам не варта спяшацца з візітам: дзіцяці неабходна 2—3 дні адаптацыі ў лагеры, і прыезд у гэты час можа толькі абвастрыць у яго жаданне вярнуцца дадому.

Калі малое адчувае сябе ў лагеры няўтульна, пастаянна настойвае на вяртанні дадому, капрызіць і плача, выхавальнікі павінны паведаміць пра гэта бацькам і вырашыць пытанне яго далейшага знаходжання ў лагеры.

АСЦЯРОЖНА: СПЁКА!

У сувязі з наступленнем спякотнага надвор'я Міністэрства аховы здароўя звяртае ўвагу на небяспеку атрымання цеплавога ўдару. Медыкі рэкамендуюць прытрымлівацца пітнога рэжыму і насіць галаўныя ўборы.

Найбольш да цеплавога ўдару схільныя пажылыя людзі і дзеці. У нованароджаных працэсы тэрмарэгуляцыі развітыя не ў поўнай меры, з узростам яна таксама пагаршаецца. Да групы рызыкі адносяцца і цяжарныя жанчыны.

Асноўнай прычынай цеплавога ўдару з'яўляецца ўздзеянне высокай тэмпературы ва ўмовах высокай вільготнасці. Таксама цеплавы ўдар можа ўзнікнуць з-за нашэння цёплага і сінтэтычнага адзення.

У гарачае надвор'е рэкамендуецца насіць лёгкае адзенне з натуральных тканін (ільну, бавоўны) і піць больш вадкасці. Па магчымасці ўстанавіць дома кандыцыянер. Перад тым, як ужываць лекавыя сродкі, пракансультавацца з урачом. Не пакідаць аўтамабіль на сонцы, калі ж гэта здарылася, не сядзець у гарачай машыне больш за 10 хвілін. Пазбягаць цяжкай фізічнай нагрузкі і сачыць за тым, каб дзеці не гулялі ў гарачае надвор'е пад адкрытым сонцам.

Высокая тэмпература цела (40 градусаў і вышэй) з'яўляецца галоўнай прыкметай цеплавога ўдару. Часта да яе дадаецца смага, адсутнасць пота, аддзялення, пачашчаныя дыханне і сэрцабіцце, пульсуючы галаўны боль. Са з'яўленнем такіх сімптомаў неабходна неадкладна выклікаць хуткую дапамогу.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Каб помнілі...

АДЗІН ДЗЕНЬ ВАЙНЫ

Свой дзень народзінаў гэта жанчына можа святкаваць двойчы. Калі верыць пашпарту, Яніна Іосіфаўна Буевіч-Колесень нарадзілася ў вёсцы Вішанькі Чашніцкага раёна 25 мая, а калі расказам родных, то 9 сакавіка таго ж 1944-га...

Асноўны ўдар па партызанах Лепельска-Ушацкай зоны рыхтавала баявая група фон Готберга. Злучэнні СС і паліцыі разлічвалі акружыць і знішчыць «лясных бандытаў». Каб гэтага не сталася, партызанам не хапала зброі. Здабыць яе вырашылі ў саміх ворагаў: зрабілі засаду на дарозе Вішанькі — Грачэвічы, напалі на калону гітлераўцаў і, знішчыўшы больш за дзясятак немцаў, узброіліся самі.

Бой гэты адбыўся раніцай, а ўжо апоўдні карнікі ўварваліся ў хату вішаньцаў Буевічаў. Цяжарную Міхаліну, яе мужа і сына Стася выпіхнулі на вуліцу, дзе ўжо сабраўся натоўп, пад канвоем павялі ў пачатак вёскі. Восем самых дужых мужчын (у тым ліку Іосіфа Буевіча) там адлучылі ад іншых і пагналі ў бок Іканак. Астатніх, зачыніўшы ў хатах Петуховых і Шумановічаў, падпалілі...

Стась з матуляй і дзевяцігадовым суседам Яфімам Булынёнкам апынуліся ля вакна палаючай хаты... Хлопчыкі выбілі шыбу, вылезлі вонкі самі, дапамаглі Міхаліне. Потым, пад кулямі, пабеглі да лесу...

Іх, усіх траіх, параніла, але найгорш прыйшлося Міхаліне. Яна, цяжарная, упала і, здавалася, ужо сыходзіла крывёй. Ва ўсякім разе, двое карнікаў, апынуўшыся побач, схіліліся над ёй, прызналі мёртвай і пайшлі. Яна ж, трохі счакаўшы і сабраўшы апошнія сілы, папаўзла далей — уратавалася сама і ўратавала дачушку, Янечку...

А вось бацьку свайго Яніна Іосіфаўна так і не ўбачыла: васьмярых адлучаных ад іншых мужчын катавалі ў Іканках у хаце Шчарбаковых. Выгнаныя адтуль гаспадары, вярнуўшыся дамоў, убачылі, што ўсе сцены там былі ў крыві. Ахвярам, мяркуючы па ўсім, пад пазногці заганялі іголкі, целы аблівалі варам, а ўрэшце, амаль замучаных, завялі ў суседнюю Межыцу і з высокага абрыву скінулі ў рэчку. Праз нейкі час было знойдзена цела Івана Булынёнка. Яго пахавалі на мясцовых могілках.

...Выбрацца з палаючых хат пашчасціла не толькі Міхаліне ды хлопчыкам, а яшчэ дзвюм дзяўчынкам Веры Булынёнак і Марфе Атрашкевіч, а таксама іх родным. Уратаваліся і тыя, хто, як толькі пачуў пра немцаў, паўцякалі з хат.

Пасля вызвалення яны пачалі новае жыццё. Міхаліне з дзецьмі дзядзька дапамог адбудаваць хату. У ёй Яніна і выраслa, потым паехала ў Барысаў да брата.

Яніна Буевіч-Колесень.

Мама іх, Міхаліна, заставалася ў Вішаньках, працавала ў калгасе, замуж болей не выйшла, хоць жанчына была прыгожая. Пад старасць яна пераехала да Яніны ў горад, дзе, дарэчы, яшчэ раз перажыла выпрабаванне агнём. З-за свавольства суседскіх хлапчукоў узнік пажар. Міхаліна ў хаце была адна і нібы зноў вярнулася ў той дзень вайны, калі абарвалася жыццё 114 яе аднавяскоўцаў.

...У родныя Вішанькі Яніна Іосіфаўна прыязджае амаль кожны год: успамінае дзяцінства, сустракаецца з вяскоўцамі, сярод якіх усё менш і менш становіцца тых, хто памятае жудасны дзень расправы.

Ірына Торбіна,
г. Чашнікі.

Яніна з мамай Міхалінай у першыя пасляваенныя гады.

Мемарыял у Вішаньках.

Рэзананс

АГРЭСАРАЎ СТАНЕ МЕНШ

Гадоў з 20 ужо пастаянна чытаю «Звязду», не раз парывалася напісаць, бо многія артыкулы, як той казаў, чаплялі за жывое. Асабліва — калі размова ішла пра гаротны лёс нашай мовы, пра вёскі, дзе дажываюць апошнія жыхары, ці нашу зямлю. Так атрымалася, што ад бацькоў мы прынялі яе жывой і больш-менш дагледжанай, а вось якой перададзім...

Трывога, згадзіцеся, небеспадстаўная, бо, што і казаць, зарастаюць нашы гароды і ўзлескі рознай нечысцю, цяжка з ёю змагацца, але ж неяк трэба, бо ніхто не вытравіць той жа баршчэўнік на подступах да сядзіб і канадскі сумнік на могілках. Трэба неяк самім.

Мы з мужам пазалетась купілі хату ў вёсцы. Да гэтага яна гадоў з дзесяць пуставала, і сяліба — сорак сотак зямлі — проста патанала ў розным быльнягу. Нешта мы адразу ж высеклі, нешта распрабавалі павыдзіраць з каранямі... З баршчэўнікам і сумнікам знаёмы аграном параіў змагацца з дапамогай касы: казаў, што калі штогод двойчы ў сезон іх скошваць, то гадоў праз пяць гэтыя агрэсары вымруць.

Так доўга чакаць нам, вядома ж, не хацелася, таму баршчэўнік (яго, на шчасце, не так шмат было) мы з усімі неабходнымі перасцярогамі проста выкапалі, а вось сумнік ужо касілі.

І што вы думаеце — ён спалохаўся? Нават не збіраўся: ён з новай сілай адрастаў і вырастаў, а месцамі — нават паспяваў зацвісці і выспеліць насенне!

Мы зжыналі яго і спальвалі ды працягвалі ваяваць з каранямі. Выкопваць іх, адразу скажу, справа не жаночая, асабліва калі кусты вялікія. Тут і вострая рыдлёўка патрэбна, і сіла немалая...

Хоць і шкада было зямлю, некалькі разоў прымянялі ядахімікаты. Зноў жа не скажу, што гэта панацэя... А таму старыя кусты паблізу ад хаты мы вырашылі ўзяць хітрасцю. Летась па вясне накрылі іх старымі шпалерамі і анучамі, засыпалі слоем зямлі, наверх насадзілі нізкарослых аксамітак. Атрымаліся вельмі прыгожыя горкі, пад якімі, мы спадзяёмся, ужо канчаткова загінулі карані раслiны-агрэсара.

...Яе, дарэчы, нездарма так называюць. І правільна пішуць, што насяваецца, што не вывесці. Мы паспрабавалі, у нас нешта атрымалася. Магчыма, атрымаецца і ў вас? Усё ж адным агрэсарам стане менш... Хоць у адным асобна ўзятым гародчыку.

Альбо абгародцы на могілках.

Л. Вайтовіч,
г. Мінск.

Чалавек — чалавеку

«ЗУБЫ ВЫРАСТУЦЬ НОВЫЯ...»

У апошнія гады перад выхадам на пенсію я працавала ў школе-інтэрнаце для дзяцей-сірот. Класы там былі вялікія — да 40 чалавек (вось і ўтрымай дысцыпліну!), вучні ўвесь час мяняліся... Некага пераводзілі ў іншыя школы, нехта «паступаў» у нашу... І ўсе, вядома ж, з рознымі ведамі. Не дзіва, што з многімі вучнямі трэба было займацца дадаткова. Але ж дзеці ёсць дзеці: з імі то цяжка, то весела.

Дзіма, помню, прыйшоў у пяты клас. Кучаравы, бялявы, шустры, на ўроках ён стараўся адказваць першым, нават не падумаўшы. На пытанне, якія атмасферныя ападкі бываюць увосень, адказаў, напрыклад: «Яблыкі, грушы, слівы...»

Цікавае тлумачэнне даў і слову «лазня». Гэта, маўляў, не што іншае, як... «лаз», «дзірка ў плоце», у якую можна некуды пралезці...

Шасцікласнік Гена якраз наадварот быў чарнявы і вельмі маўклівы. Ён не любіў падымаць руку, быццам баяўся — ці то пытанняў, ці то сваіх адказаў. А тут...

Ідзе неяк раз урок паўтарэння, вучні быццам навыперадкі спяшаюцца паказаць свае веды: пытанне — адказ, пытанне — адказ, адзін перад адным.

Гена, як звычайна, сядзіць ціха. І раптам... цягне руку, нават трасе ёю! Ну, думаю, нешта ведае... Адважыўся хлопчык!.. Выклікаю і чую: «Калі ласка, выключце святло. У класе ж сонца свеціць!»

Дзеці ў рогат: Гена — бач — за эканомію...

А вось у Сашы ўжо іншы клопат быў. Ён — высокі, статны юнак — прыехаў да нас аднекуль з Магілёўшчыны і пасля першага ж урока шчыра прызнаўся, што па-беларуску «ні ў зуб нагой», што наша мова для яго, як замежная... А напярадзе ж у хлопца экзамен. Як ён будзе здаваць?

Сталі мы з Сашам займацца асобна: слоўнікі, канспекты, пераказы, магнітафонныя запісы, вершы...

Урэшце ўсё гэта прынесла плён: хлопец здаў экзамен, і, што здзівіла, нават лепш за аднакласнікаў!

Балела душа і за Міхаську. На самым пачатку чэрвеня да нашых дзяцей далучылі групу будучых першакласнікаў з Лідскага дзетдома. Яны, а значыць і мы, настаўнікі, збіраліся ў лагер. «Ніколі не працавала з такімі маленькімі, — разгубілася я. — Можа, ці спраўлюся?» — «Ды не бойцеся, — супакоіла наша дырэктар. — Працуйце з імі ну... як са сваімі ўнукамі».

На той час у мяне ўжо праўда былі дзве ўнучачкі. Мусіць, таму і новыя дзеткі з дзетдома здаліся такімі ж мілымі. У аднаго з хлопчыкаў амаль тут жа знайшоўся старэйшы брат (проста з іншым прозвішчам), у другога, як аказалася, мама вучылася ў нашай школе, і ён па ёй вельмі сумаваў...

Выдзяляўся з усіх і Міхаська — кругленькі, ружовашчокі. Дагэтуль ён жыў толькі з татам і, падобна, быў па-мужчынску скупым на ласку. А дзіцяці ж яна патрэбна...

Помню, перад «адбоем» абыходжу спальні, а хлопчык ціхенька просіць:

— Калі ласка, пасядзіце са мной.

Ну як тут адмовіць, як не прысесці — хоць на некалькі хвілін (болей нельга, бо іншыя дзеці будуць раўнаваць)...

А Міхаську таго і дастаткова: ён шчасліва ўсміхаецца і засынае.

Прыехаўшы дамоў, расказваю пра гэта ўнучкам, і мая чатырохгадовая Хрысцінка раптам кажа:

— Бабуля, а ты забяры Міхася да сябе і гадуй. Няхай у нашай мамы (заўважце — не ў яе!) маленькі брацік будзе.

— Нельга, — кажу, — у хлопчыка ж ёсць тата, ён не аддасць сынка ў чужую сям'ю.

І вось канец жніўня. Усе дзеці вяртаюцца з лагера. Міхасёк здалёк усміхаецца мне — пазнаў!

Ён жа і яшчэ праз некалькі дзён падбягае... заплаканы.

— Што здарылася? — пытаю ў малога.

— Ды во, паглядзіце, — пальчыкам тыцкае ў рот, — мой зубік выпаў.

— Нічога, — супакойваю, — гэта ж малочны. Іншыя, дзіцячыя зубы, таксама выпадуць, а вырастуць новыя, моцныя, як у дарослых.

— А потым залатыя, як у вас? — радуецца Міхась.

...Гэта была наша апошняя сустрэча. Хлопчыка забралі ў санаторную школу, і я пра яго больш нічога не чула.

У хуткім часе перастала існаваць і наша школа-інтэрнат: там размясціўся ліцэй, там вучацца іншыя дзеці, з якімі ўжо іншым настаўнікам то цяжка, то весела.

Леанарда Аляшэвіч,
г. Смаргонь.

След на зямлі

УСІМ ДАХАМ ДАХ!

Жыхар вёскі Хадзявічы Слонімскага раёна Рыгор Важэйка пачаў будаваць сабе хату недзе пасля вайны. Сцены паставіў хутка, а вось на даху — вырашыў сэканоміць: скарыстацца гільзамі ад снарадаў.

У лесе іх тады валялася шмат. Так што вяскоўцу заставалася запрэгчы каня, назбіраць, прывезці дамоў, потым зубілам высекчы роўныя кавалачкі металу. Імі і накрыты яго хата, веранда, хлеў. Цяпер на сядзібе гэтага ўмельца і працаголіка знаходзіцца мясцовы ФАП. І дах над ім — ну як новы! «Тысячу гадоў прастаіць», — кажуць вяскоўцы.

Сяргей ЧЫГРЫН, фота аўтара.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.